# Культурная лыжня — 2023




**Культурна-спартыўнае свята разгарнулася сёння на Мінскай гарадской лыжаролернай трасе.**

Мерапрыемства праходзіць у рамках рэспубліканскай зімовай спартакіяды работнікаў культуры "Культурная лыжня — 2023".

На старт выйшлі каманды Міністэрства культуры, Беларускай дзяржаўнай філармоніі, Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, Гомельскага дзяржаўнага цырка.

Сярод удзельнікаў таксама прадстаўнікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Поруч з імі — супрацоўнікі Беларускай харэаграфічнай гімназіі-каледжа, Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава.

Спаборніцтвы не абышлі бокам і музейшчыкаў. У спісе канкурсантаў заяўлены Нацыянальны гістарычны і Нацыянальны мастацкі музеі, Мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой", Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальны музей-запаведнік "Нясвіж", Замкавы комплекс "Мір", а таксама літаратурныя музеі Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Сталі на лыжы работнікі Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм", Нацыянальнай бібліятэкі. Прыехалі на сяброўскую сустрэчу і супрацоўнікі рэгіянальных устаноў культуры з усіх абласцей краіны.

У сумленнай барацьбе каманды даказалі, што здольныя "ставіць рэкорды" не толькі ва ўсіх відах мастацтва. Удзельнікам спартакіяды па сілах заваяваць і спартыўны Алімп.

Падрабязнасці — у наступным нумары.